ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў трэба прывесці ў адпаведнасць з еўрапейскімі стандартамі вышэйшай школы. Дыплом выпускніка Беларускага універсітэта культуры ў перспектыве павінен стаць юрыдычным дакументам у межах усёй еўрапейскай супольнасці.

Набыццё статуса такога ўзроўню патрабуе, безумоўна, намаганняў і вялікіх сродкаў, але справа таго вартая.

Баканава Н.Д.,
выкладчык

## НАРОДНАЯ ПЕСНЯ Ў НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ І ТВОРЧЫМ ВЫХАВАННІ СТУДЭНТАЎ ПА ПАСТАНОЎЦЫ ГОЛАСУ

Гісторыя, культура беларускага народа знайшлі сваё адлюстраванне ў народных песнях, дайшоўшых да нас у шматлікіх выданнях. У песнях паказана жыццё людзей з іх клопатамі і штодзённай працай, зімовымі святамі, прыгодамі вясны, зборам ураджаю і мноствам іншых разнастайных з'яў. Дзякуючы нястомнай працы збіральнікаў мы сёння маем магчымасць карыстацца гэтымі каштоўнымі здабыткамі ў сваёй працы.

На Беларусі ў сучасны момант мы маем высокамастацкія прыклады народных песень, вясельных абрадаў, святкавання калядаў. Вялікае значэнне ў жыцці беларуса мелі веснавыя абрады з іх рытуальнымі песнямі падчас пачатку веснавых работ на полі, агляду палеткаў, абрады зажынак, жніва, дажынак і іншыя, дзе ўвесь час гучала народная песня, якая моцна ўздзейнічала на душу слухача і выканаўца. Праз пакаленні дайшла народная песня да нас, і мы павінны не толькі зберагчы яе, але і перадаць нашым нашчадкам, а творчую моладзь, студэнтаў нашай установы, выхаваць у прыхільнасці, любові і глыбокай павазе да спадчыны.

Раней было так, што моладзь разам са старэйшымі ўдзельнічала ва ўсіх праявах жыцця. Найвышэйшы душэўны ўздым абавязкова выяўляўся ў песні, дзе выкладалася падчас цэлае жыццё чалавека. Песня жыла і пераходзіла ад аднаго пакалення да другога. Іншая справа цяпер, калі моладзь рушыла ў гарады, не бачыць і не ўдзельнічае ў абрадах, не чуе жывога народнага слова і губляе свае вытокі. Таму трэба знаёміць студэнтаў з лепшымі ўзорамі беларускіх народных песень, тлумачыць ім, калі яны выконваліся, знаёміць з асаблівасцямі выканання. Народная песня мае вельмі важкую ўласцівасць - уздзейнічаць на душу слухача і выхоўваць яго мастацкі густ. Таму работа па пастаноўцы голасу на кафедры мастацкай творчасці пачынаецца з беларускай народнай песні.

Песні маюць адрозненні ў залежнасці ад рэгіёна іх бытавання і ў залежнасці ад моўных асаблівасцей гэтага рэгіёна.

Вялікі польскі этнограф Міхал Хведароўскі (1853 - 1923), які запісаў шмат паданняў, прыказак, прымавак і песень з заходняй Беларусі, падчас свайго допісу да інтэлігенцыі беларускай паведамляе пра той каштоўны скарб, які ён здабыў у нашых крэсах, і спадзяецца на тое, што нашчадкі будуць мець плён ад гэтых скарбаў. Яшчэ Міхал Хведароўскі пісаў, што ніякі другі народ не захаваў так, як беларусы, свае песні, дзе кожная - гэта цэлае жыццё.

Каб пазнаць народ, трэба пазнаць яго культуру, мову, рамяство, уклад жыцця, яго адносіны да разнастайных з'яў, да іншых народаў. На разнастайнасць беларускіх народных песень вялікі ўплыў аказваюць, як мы ўжо адзначалі, рэлігійныя і моўныя адрозненні. Так, напрыклад, беларускае Палессе налічвае мноства песень, падобных да тыповых песень з іншых мясцін Беларусі, але ў меладычных адносінах яны маюць свае асаблівасці. Акрамя гэтага, трэба яшчэ дадаць, што песні Палесся выконваюцца інакш, чым песні Міншчыны ці Віцебшчыны, на гэта ўплывае меладычны склад і дыялект рэгіёна.

У навучальным працэсе па выхаванні асобы, здольнай арганізаваць творчы калектыў, праявіць сябе як прафесійны выканаўца, вялікае значэнне мае комплекс тых дысцыплін, якія вывучаюцца ва універсітэце. Намаганні выкладчыкаў кафедры павінны быць скіраваны на тое, каб падрыхтаваць прафесійна адукаванага спецыяліста, які адпавядае міжнароднаму ўзроўню. Таму вялікае значэнне маюць вывучэнне народнай творчасці, заняткі па пастаноўцы голасу, дырыжыраванні, у харавым класе і інш. Гэта таксама садзейнічае выхаванню любові да роднай песні, да роднага слова, да ўсяго, што нам засталося ў спадчыну на нашай Бацькаўшчыне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ